# БІБЛІЯТЭКА НА АЎТАМАШЫНЕ

У пачатку гэтага года Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна арганізавала перасовачную бібліятэку на аўтамашыне для абслугоўвання калгасаў і соўгасаў Менскага раёна. Бібліятэка абслугоўвае 15 пунктаў. Кожны вечар яна выязджае ў калгас ці соўгас, дзе работнікі бібліятэкі выдаюць і абменьваюць кніжкі, арганізуюць літаратурныя вечары, праводзяць гутаркі і даклады аб творчасці пісьменнікаў, даюць алказы па прачытаных кніжках. Бібліятэка мае 465 чытачоў, на руках якіх знаходзіцца 675 кніжак.